**ПАМЯТКА ЎДЗЕЛЬНІКУ РЭПЕТЫЦЫІ ЦЭНТРАЛІЗАВАНАГА ЭКЗАМЕНУ – 2025**

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Пасля завяршэння працэдуры рэгістрацыі для ўдзелу ў рэпетыцыі цэнтралізаванага экзамену (далей – РЦЭ) удзельніку РЦЭ выдаецца пропуск.

1.2. Удзельнік РЦЭ **МАЕ ПРАВА:**

зарэгістравацца для ўдзелу ў РЦЭ па беларускай або рускай мове (на выбар), або адным профільным прадмеце (на выбар);

**карыстацца толькі на РЦЭ** ***па хіміі і фізіцы*** **калькулятарам**, які не з’яўляецца сродкам захавання, прыёму і перадачы інфармацыі.

1.3. **Удзельніку РЦЭ неабходна прытрымлівацца дзелавога стылю адзення.**

1.4. Удзельнік РЦЭ павінен прыбыць у пункт правядзення РЦЭ, маючы пры сабе пропуск, дакумент, які сведчыць асобу (пашпарт, ID-картка (пластыкавая смарт-картка), від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, пасведчанне бежанца, даведка, якая выдаецца ў выпадку страты (крадзяжу) дакумента, які сведчыць асобу), ручку (гелевую або капілярную) з чарнілам чорнага колеру, калькулятар (толькі на РЦЭ па хіміі і фізіцы). Удзельнікі РЦЭ, раней не зарэгістраваныя або якія не маюць пры сабе дакумента, які сведчыць асобу, да праходжання РЦЭ не дапускаюцца.

Удзельнік РЦЭ, які прыбыў на РЦЭ пасля распячатвання пакета з экзаменацыйнымі работамі, у аўдыторыю не дапускаецца.

1.5. Пры атрыманні экзаменацыйных матэрыялаў **удзельнік РЦЭ абавязаны пераканацца ў адпаведнасці нумара варыянта бланка адказаў нумару варыянта экзаменацыйнай работы**. Удзельнік РЦЭ **забяспечвае захаванасць** экзаменацыйных матэрыялаў з моманту іх атрымання да моманту перадачы педагагічным работнікам у аўдыторыі.

Пасля заканчэння часу, адведзенага на выкананне экзаменацыйнай работы, удзельнік РЦЭ здае экзаменацыйныя матэрыялы і лісты для рабочых запісаў. Удзельнік РЦЭ, які завяршыў выкананне экзаменацыйнай работы раней вызначанага тэрміну, можа пакінуць аўдыторыю.

1.6. Удзельнікам РЦЭ падчас правядзення **НЕ ДАЗВАЛЯЕЦЦА:**

праносіць, а таксама выкарыстоўваць у аўдыторыях, дзе праводзіцца РЦЭ, любыя прадметы, акрамя дакумента, які сведчыць асобу, ручкі (гелевай або капілярнай) з чарнілам чорнага колеру, пропуска, калькулятара (толькі на РЦЭ па хіміі і фізіцы);

фальсіфікаваць даныя ў вобласці рэгістрацыі бланка адказаў;

мяняцца месцамі, экзаменацыйнымі матэрыяламі, выкарыстоўваць дапамогу іншых асоб для выканання экзаменацыйнай работы;

уносіць інфармацыю ў бланк адказаў пасля заканчэння часу, адведзенага на выкананне экзаменацыйнай работы;

мець пры сабе сродкі сувязі, электронна-вылічальную тэхніку, фота-, аўдыё- і відэаапаратуру, даведачныя матэрыялы на любым носьбіце, пісьмовыя заметкі і іншыя прылады прыёму, захоўвання і перадачы інфармацыі;

выносіць з аўдыторый і пункта правядзення РЦЭ экзаменацыйныя матэрыялы, лісты для рабочых запісаў, пісьмовыя заметкі;

фатаграфаваць экзаменацыйныя матэрыялы;

размаўляць паміж сабой, абменьвацца любымі матэрыяламі і прадметамі з іншымі ўдзельнікамі РЦЭ;

самавольна выходзіць з аўдыторыі і перамяшчацца па пункце правядзення РЦЭ без суправаджэння педагагічнага работніка па-за аўдыторыяй.

Удзельнік РЦЭ, які парушае патрабаванні праходжання РЦЭ, выдаляецца з аўдыторыі.

1.7. Удзельнікі РЦЭ могуць выходзіць з аўдыторыі па ўважлівай прычыне (у тым ліку дрэннае самаадчуванне, фізіялагічныя патрэбы) падчас правядзення РЦЭ толькі ў суправаджэнні педагагічнага работніка, які забяспечвае правядзенне РЦЭ па-за аўдыторыяй. Пры выхадзе з аўдыторыі ўдзельнік РЦЭ пакідае экзаменацыйныя матэрыялы і лісты для рабочых запісаў на рабочым месцы ў аўдыторыі побач з дакументам, які сведчыць яго асобу. Адказны педагагічны работнік папярэдне ў прысутнасці ўдзельніка РЦЭ правярае камплектнасць экзаменацыйных матэрыялаў, якія ўдзельнік РЦЭ пакідае. Час знаходжання ўдзельніка РЦЭ па-за аўдыторыяй уключаецца ў агульны час праходжання РЦЭ. Пра гэта ўдзельнік РЦЭ папярэджваецца да выхаду з аўдыторыі.

## 2. **Правілы запаўнення бланка адказаў**

2.1. Інфармацыя, унесеная ў бланк адказаў, апрацоўваецца ЭВМ аўтаматычна, таму пры запаўненні бланка адказаў неабходна дакладна выконваць устаноўлены парадак.

2.2. Унясенне інфармацыі ў бланк адказаў удзельнікамі РЦЭ выконваецца толькі ў спецыяльна вызначаныя палі чорным чарнілам (гелевай або капілярнай ручкай). Кожнае поле запаўняецца пачынаючы з першай клеткі. Клеткі поля, якія засталіся, не запаўняюцца.

2.3. Лічбы і літары пішуцца ў адпаведнасці з узорамі напісання сімвалаў, размешчанымі ў верхняй частцы бланка адказаў (у інструкцыі да экзаменацыйнай работы). Выпадковыя паметкі недапушчальныя.

2.4. Вобласць рэгістрацыі бланка адказаў запаўняецца ўдзельнікам РЦЭ на той дзяржаўнай мове, на якой пададзена заява на ўдзел у РЦЭ. Подпіс удзельніка РЦЭ на бланку адказаў не павінен выходзіць за рамкі абмежавальнай лініі. Прозвішча, уласнае імя і імя па бацьку (калі такое ёсць) удзельніка РЦЭ, серыя і нумар дакумента ўносяцца ў бланк адказаў у строгай адпаведнасці з запісам у дакуменце, які сведчыць асобу.

2.5. Вобласць адказаў складаецца з дзвюх частак: часткі «А» – для адказаў на заданні з выбарам адказу з прапанаваных варыянтаў адказаў; часткі «В» – для кароткіх адказаў на заданні без выбару адказу.

Частка «А» вобласці адказаў складаецца з гарызантальнага рада нумароў экзаменацыйных заданняў. Пад кожным нумарам экзаменацыйнага задання размешчаны вертыкальны слупок з пяці клетак для абазначэння выбранага адказу меткай.

Узор меткі прыведзены ў бланку адказаў. Лінія меткі не павінна быць тоўстай. Калі ручка пакідае занадта тоўстую лінію, замест меткі трэба правесці толькі адну лінію (па дыяганалі клеткі). Не дапускаецца выпраўляць метку графічным спосабам (заштрыхоўваць) або замазваць карэктавальнай вадкасцю.

Для ўнясення адказу ўдзельнік РЦЭ пад нумарам задання павінен паставіць метку ў тую клетку, нумар якой адпавядае нумару выбранага ім адказу.

Адказы на заданні часткі «В» вобласці адказаў неабходна запісваць справа ад нумара задання ў вобласці адказаў, прызначанай для кароткіх адказаў на экзаменацыйныя заданні.

Адказ даецца толькі ў кароткай форме (слова, словазлучэнне, спалучэнне літар і лічбаў або цэлы лік). Кожная лічба, літара або знак мінус (калі лік адмоўны) запісваюцца ў асобную клетку.

Адказ, які складаецца з двух слоў, пішацца разам, без прабелу. Калі літар у такім слове акажацца больш, чым клетак у полі адказу, то другую частку слова можна пісаць больш сцісла (не прытрымліваючыся пападання ў клетку). Словы трэба пісаць поўнасцю.

Адказ (слова або словазлучэнне) даецца на мове і ў форме (род, лік, склон), якія вызначаюцца ўмовай задання. Арфаграфічныя памылкі ў адказе недапушчальныя.

Лікавы адказ у выглядзе дробу акругляецца да цэлага ліку па правілах матэматычнага акруглення.

Недапушчальна запісваць адказ у выглядзе матэматычнай формулы або выразу, указваць назвы адзінак вымярэння (градусы, працэнты, метры, тоны), даваць слоўныя загалоўкі або каментарыі да ліку.

2.6. Адмена памылковай меткі (частка «А») выконваецца ў полі адмены памылковых метак. У адным заданні можна адмяніць некалькі памылковых метак. Для адмены памылковага адказу і ўказання правільнага неабходна:

адмяніць метку, адзначыўшы нумар экзаменацыйнага задання і нумар памылкова выбранага варыянта адказу;

паставіць метку ў патрэбнай клетцы слупка экзаменацыйнага задання.

Таксама неабходна адмяняць усе выпадковыя меткі, рысачкі, кропкі.

Замена памылковых кароткіх адказаў на заданні і ўказанне правільнага адказу (частка «В») выконваецца ў адпаведным полі. Для замены памылковага і ўказання правільнага адказу неабходна ўказаць нумар няправільна выкананага задання і запісаць правільны адказ.

2.7. Выкарыстанне ненарматыўнай лексікі і іншае наўмыснае парушэнне ўстаноўленага парадку запаўнення бланка адказаў недапушчальнае.

## 3. **Рэзультаты РЦЭ**

3.1. Не апрацоўваюцца і не правяраюцца запісы на экзаменацыйных работах і лістах для рабочых запісаў, бланкі адказаў без указання прозвішча і (або) уласнага імя ўдзельніка РЦЭ.

3.2. Інфармацыю аб рэзультатах РЦЭ можна атрымаць на сайце УА «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў» (РІКВ) rikc.by.

**Жадаем поспехаў!**